«Па закліку сапраўднай любові»

*Разнастайныя мерапрыемствы прайшлі на Случчыне 16-22 мая падчас XII Майскіх Віткаўскіх чытанняў*

Чытанні прысвечаны нашаму славутаму земляку пісьменніку, паэту, публіцысту Васілю Вітку і яго творчасці. Урачыстае адкрыццё мерапрыемстваў адбылося ў раённай цэнтральнай бібліятэцы. У госці да чытачоў бібліятэкі завіталі галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі і супрацоўнікі рэдакцыі. Намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама Наталля Вікенцьеўна Чарнушэвіч зачытала прывітальны адрас старшыні Слуцкага райвыканкама ўдзельнікам Віткаўскіх чытанняў, да школьнікаў звярнуўся Уладзімір Ліпскі

У рамках творчага праекта «З адной кнігай - па ўсёй Беларусі» прайшла прэзентацыя кнігі У. Ліпскага «Мая Беларусь».